ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 12 (1048) ● Чацвер, 4 красавіка 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.

## АБМЕРКАВАНА РЭКТАРАТАМ

У панядзелак на пасяджэнні рэктарата сакратар камітэта камсамола БДУ У. А. Навумовіч далажыў аб мерапрыемствах штаба працоўных спраў па падрыхтоўцы да летняга працоўнага семестра. Пры абмеркаванні стану падрыхтоўчага перыяду была звернута ўвага на недахопы ў камплектаванні будаўнічых атрадаў, выказан шэраг слушных меркаванняў па лепшай арганізацыі працоўнага семестра.

Па другому пытанню парадку дня пасяджэння — аб выкананні плана прыёму ў аспірантуру ў 1973 годзе і падрыхтоўцы да прыёму ў 1974 годзе даклад зрабіў загадчык аспірантуры Э. У. Драб.

Дырэктар выдавецтва Л. А. Севасцьянчык далажыла аб тэматычным плане выпуску літаратуры на 1975 год.

**В. КАЛІНІК.**

## АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

## XXXI НАВУКОВАЯ

Пазаўчора ва універсітэце пачала работу XXXI студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 104-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

У канферэнцыі прымаюць удзел усе факультэты, а таксама госці з іншых вну краіны. Усяго будзе прачытана больш 800 дакладаў па актуальных праблемах сучаснай навукі.

## *СУСТРЭЧА З ДЭЛЕГАТАМ*

Адбыўся камсамольскі сход кафедры ядзернай фізікі фізічнага факультэта. Камсамольцы абмеркавалі матэрыялы XXV з'езда ЛКСМБ, сустрэліся з дэлегатам з'езда студэнткай філфака Л. Тарасюк.

Аб задачах па далейшаму паляпшэнню камуністычнага выхавання моладзі гаварыў адказны за камсамольскую работу ад партгрупы Уладзімір Шляхцін. Ён падкрэсліў, што галоўнае для студэнтаў — аваладанне ведамі, сур'ёзныя адносіны да вучобы.

Л. Тарасюк расказала аб сяброўскай, дзелавой і творчай атмасферы з'езда, падзялілася з прысутнымі сваімі ўражаннямі.

**А. ПАТАПЕНКА.**

## ПЛАН — ДАТЭРМІНОВА

Сацыялістычныя абавязацельствы на 1974 год прыняў калектыў вучэбна-доследнай гаспадаркі БДУ. У вызначальным годзе пяцігодкі ён вырашыў рэалізаваць прадукцыі на суму 150 тысяч рублёў, даць 80 тысяч рублёў прыбытку. Пры гэтым норма выпрацоўкі плануецца не ніжэй 110 працэнтаў.

Сярод асноўных пунктаў сацыялістычных абавязацельстваў наступныя:

— закласці пасяўное аддзяленне плошчай 0,7 га і атрымаць 700 тысяч штук сеянцаў прыжывальнасцю 95 працэнтаў;

— на плошчы 2,5 га закласці драўнінную школу з высадкай 25,5 тысячы штук саджанцаў і на плошчы 5,6 га — хмызняковую школу на 10 тысяч штук саджанцаў;

— прывіць 500 чайна-гібрыдных руж;

— пабудаваць чацвёртую цяпліцу з плёначным пакрыццем;

— сабраць ураджай садавіны не менш 750 цэнтнераў.

Калектыў бярэ абавязацельства змагацца за высокую працоўную дысцыпліну, рацыянальнае выкарыстанне рабочага дня, укараненне ў вытворчасць машын і механізмаў з мэтай памяншэння долі ручной працы, а таксама нарошчваць вытворчыя магутнасці дэкаратыўнага, кветкавага, садовага аддзелаў і пчолапасекі.

Калектыў вучэбна-доследнай гаспадаркі намячае выканаць вытворчы план 1974 года да 1 снежня.

**В. КАТУСАЎ.**



Міма дзвярэй 206-й аўдыторыі, дзе ідзе размеркаванне гісторыкаў, не пройдзеш раўнадушна. Перадаецца і табе хваляванне, выклікае спачуванне нецярплівасць выпускнікоў хутчэй даведацца аб месцы работы.

Праходзіць некалькі гадзін, і ўсё становіцца ясным. Дзесяць рабят накіраваны ў распараджэнне Міністэрства абароны, пяць выпускнікоў будуць працаваць у вышэйшых навучальных установах, большасць жа выпускнікоў гасцінна сустрэнуць у школах Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і іншых абласцей рэспублікі.

**На здымках:** ідзе пасяджэнне камісіі па размеркаванню; чакае вырашэння свайго лёсу Людміла **Кайгародава.** Яе ведаюць ва універсітэце не толькі як добрую студэнтку, але і як выдатную спартсменку, удзельніцу усесаюзных і міжнародных спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы.

Фота **Д. Чаховіча.**





# З ПОЎНАЙ МЕРАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ І АДКАЗНАСЦІ

**На мінулым тыдні савет універсітэта абмеркаваў вынікі першага семестра сёлетняга навучальнага года і задачы калектыву універсітэта ў вызначальным годзе пяцігодкі па паляпшэнню вучэбна-метадычнай і палітыка-выхаваўчай работы.**

**З дакладам выступіў прарэктар БДУ прафесар А. Я. Малышаў. Ён падкрэсліў важныя моманты ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў сучаснага ўзроўню, прааналізаваў стан паспяховасці па ўсіх формах навучання, асаблівую ўвагу звярнуў на падрыхтоўчае аддзяленне, сканцэнтраваў увагу прысутных на вузлавых пытаннях і галоўных напрамках дзейнасці універсітэцкага калектыву.**

**Сёння мы прапануем увазе чытачоў частку матэрыялу з даклада.**

Неабходна значна палепшыць вучэбна-метадычную работу са студэнтамі малодшых курсаў, правільна арганізаваць і ўзмацніць кантроль за іх самастойнай работай, весці сістэматычны ўлік паспяховасці. Неаслабнай увагі патрабуе правядзенне калёквіумаў, субяседаванняў, семінараў і кантрольных работ, кансультацый, алімпіяд і віктарын па асобных раздзелах вывучаемых дысцыплін. Выкладчыкі, якія працуюць на першых і другіх курсах, абавязаны вучыць студэнтаў уменню працаваць над кнігай, запісваць лекцыі, канспектаваць, складаць планы выступленняў на семінарскіх занятках, пісаць рэферат і навуковую работу на вызначаную тэму. Належыць больш глыбока знаёміць студэнтаў першага курса з будучай спецыяльнасцю, аргнізоўваць экскурсіі на прафіліруючыя кафедры, сустрэчы з вядучымі вучонымі, выкладчыкамі факультэтаў.

На бягучую і выніковую паспяховасць у вялікай ступені адмоўна ўплывае недысцыплінаванасць асобных студэнтаў. На працягу семестра на дзённай форме навучання, напрыклад, прапушчана без уважлівых прычын 17626 гадзін. Агульны працэнт наведвання па універсітэту склаў 98,2 працэнта, па асобных жа факультэтах: прыкладной матэматыкі — 98,5 працэнта, юрыдычнаму — 99,0 філалагічнаму — 96,6, гістарычнаму — 96,2, матэматычнаму — 98,9, фізічнаму — 98,6, хімічнаму — 99,83, біялагічнаму — 97,6, журналістыкі — 96,6, геаграфічнаму—98,1 і спецфакультэту прыкладной матэматыкі—97,1 працэнта. З прыведзеных даных бачна, што найбольшая колькасць прапушчаных заняткаў на філалагічным, гістарычным, біялагічным, факультэце журналістыкі і спецфакультэце прыкладной матэматыкі.

Наведванне заняткаў студэнтамі-вячэрнікамі ў першым семестры 1973-74 навучальнага года склала па універсітэту 95,1 працэнта, што на 1,1 працэнта вышэй, чым у мінулым годзе.

Многія студэнты часта спазняюцца на заняткі, у аўдыторыю заходзяць пасля выкладчыка, а самі выкладчыкі гэтаму не надаюць сур'ёзнага значэння, што дрэнна ўплывае на арганізацыю вучэбнага працэсу. Як правіла, пытаннямі вучэбнай дысцыпліны у асноўным займаюцца дэканы, іх намеснікі і ў якойсьці меры куратары,, у меншай ступені выкладчыкі, што недапушчальна. У сувязі з недастатковай патрабавальнасцю да студэнтаў, асабліва вячэрняй формы навучання, некаторыя з іх не выконваюць элементарныя правілы паводзін ва універсітэце: у памяшканнях ходзяць у галаўных уборах, на занятках верхняе адзенне складваюць прама ў аўдыторыях, кураць, дзе ім захочацца (юрыдычны і матэматычны факультэты).

Дэканатам і кафедрам неабходна стварыць атмасферу нецярпімасці да парушальнікаў дысцыпліны, да двоечнікаў, прагульшчыкаў і адначасова шырока прапагандаваць вопыт вучэбнай і грамадскай работы імянных стыпендыятаў і студэнтаў-выдатнікаў.

Сур'ёзнае пытанне арганізацыі вучэбнага працэсу — прымяненне тэхнічных сродкаў. Трэба прама сказаць, што на факультэтах БДУ усё яшчэ слаба ўкараняюцца тэхнічныя сродкі ў вучэбны працэс. Многія загадчыкі кафедр не праяўляюць неабходнай зацікаўленасці. А без ініцыятывы, настойлівасці і жадання працаваць з тэхнічнымі сродкамі цяжка рашыць гэтую праблему.

Дзякуючы намаганням рэктарата, дэканатаў, кафедр ва універсітэце ў цяперашні час ёсць 16 аўдыторый (класаў, кабінетаў), у рознай ступені абсталяваных тэхнічнымі сродкамі, 12 аўдыторый з гэтага ліку кінафікавана. Кафедры валодаюць значнай колькасцю сродкаў статычнай праекцыі, гуказапісу, гукаўзмацняльнага абсталявання, тэхнічных прылад для навучання і кантролю ведаў студэнтаў, кінафотаабсталявання. На факультэтах, кафедрах, у лабараторыях ёсць каля 70 дыяпраектараў розных тыпаў, тры кадаскопы, 25 эпідыяскопаў, 25 фільмаскопаў, г. зн. 120 адзінак статычнай праекцыі, адзін відыёмагнітафон, вялікая колькасць магнітафонаў розных тыпаў ад партатыўных да стацыянарных, больш 30 кінакамер, тры фотаружжы, больш 250 фотаапаратаў, тры фоталабараторыі, дзве тэлевізійныя ўстаноўкі, 67 машын «Ластаўка» і «КІСІ-5» для кантролю ведаў студэнтаў. Размеркаваны гэтыя сродкі па факультэтах і кафедрах. На жаль, эфектыўна выкарыстоўваюцца яны толькі нямногімі кафедрамі.

Шырока выкарыстоўваюць вучэбнае кіно і дыяпраекцыйныя сродкі кафедры гісторыі КПСС, гісторыі БССР, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, тэорыі і практыкі радыё- і тэлебачання, кафедры біялагічнага і геаграфічнага факультэтаў, на падрыхтоўчым факультэце і падрыхтоўчым аддзяленні, ваеннай кафедры. На гэтых кафедрах сваімі сіламі зроблена значная колькасць дыядапаможнікаў (дыяфільмаў, дыяпазітываў).

Не выкарыстоўваюць поўнасцю магчымасці для вырабу дыяпазітываў факультэты: юрыдычны, фізічны, журналістыкі, якія валодаюць добра абсталяванымі фоталабараторыямі. На асобных кафедрах частка абсталявання зусім не выкарыстоўваецца. Кафедра крыміналістыкі ўжо 6 год як набыла тэлевізійную ўстаноўку, але да гэтай пары яна не ўстаноўлена. Слаба займаецца ўкараненнем тэхнічных сродкаў кафедра грамадзянскай абароны. Некаторыя кафедры гуманітарных факультэтаў, кафедры матэматычных факультэтаў, кафедры замежных моў (за выключэннем кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў) вельмі слаба выкарыстоўваюць тэхнічныя сродкі ў вучэбным працэсе.

Распрацоўкай пытанняў методыкі выкарыстання тэхнічных сродкаў і праграміраванага навучання займа-

*(Працяг на 2-й стар.).*

# З ПОЎНАЙ МЕРАЙ ІНІЦЫЯТЫВЫ І АДКАЗНАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

юцца толькі некалькі кафедр (педагогікі і псіхалогіі, агульнай фізікі, французскай мовы, фізічнай геаграфіі замежных краін).

Без мэтанакіраванай работы па прымяненню тэхнічных сродкаў наўрад ці ўдасца па-сур'ёзнаму паставіць гэту справу. Кожная кафедра павінна скласці грунтоўныя планы іх прымянення і дабівацца здзяйснення гэтых планаў. Цяпер пры ацэнцы работы любой кафедры абавязкова будзе ўлічвацца, як і ў якой меры яна выкарыстоўвае тэхнічныя сродкі ў вучэбным працэсе.

Рэктарат прымае меры, каб абсталяваць аўдыторыі комплексам тэхнічных сродкаў навучання, набыць лінгафоннае абсталяванне, кіна-, дыядапаможнікі і г. д.

Пры ўважлівым разглядзе вынікаў зімовай экзаменацыйнай сесіі, пастаноўкі вучэбна-метадычнай і палітыка-выхаваўчай работы на кафедрах і факультэтах можна зрабіць вывад, што ўзровень арганізатарскай дзейнасці кафедр і факультэтаў не адпавядае яшчэ сучасным патрабаванням, якія паставілі перад вышэйшай школай XXIV з'езд КПСС і XXVII з'езд КПБ па паскарэнню тэмпаў навукова-тэхнічнага прагрэсу і паляпшэнню якасці выпускаемых спецыялістаў.

Мы яшчэ не змаглі вучэбны працэс ва ўсіх яго відах і формах паставіць на навуковую аснову, не распрацавалі на ўсіх факультэтах вучэбна-метадычныя планы па кожнаму курсу.

У красавіку мінулага года на савеце універсітэта было абмеркавана пытанне «Аб навуковай арганізацыі вучэбнага працэсу і яго планаванні на 1973-1974 навучальны год». Па гэтаму пытанню вучэбная частка распрацавала рэкамендацыі, яны даведзены да ведама калектываў кафедр і факультэтаў. Аднак на большасці факультэтаў і кафедр гэтыя рэкамендацыі не знайшлі практычнага прымянення. Не на ўсіх факультэтах арганізавана работа па складанню сеткавых графікаў праходжання вучэбных дысцыплін за ўвесь перыяд навучання, графікаў патыднёвага праходжання дысцыплін на I і II курсах, па вызначэнню аптымальнага размеркавання вучэбнага часу паміж аўдыторнымі заняткамі і самастойнай работай студэнтаў і г. д.

На радзе факультэтаў не распрацавалі памятак, асабліва для студэнтаў першых і другіх курсаў, аб вучэбным плане, не далі ім патыднёвых раскладаў па кожнаму прадмету, не вызначылі ў адпаведнасці з гэтымі раскладамі паслядоўнасць і формы кантролю за работай студэнта і засваеннем ім матэрыялу.

Характэрная асаблівасць сучаснага стылю падрыхтоўкі спецыялістаў — выхаванне ў моладзі арганічнай патрэбы весці творчы пошук. Неабходна шырэй разгарнуць гэту работу на факультэтах, устанавіць больш цесныя сувязі з інстытутамі АН БССР і іншымі навукова-даследчымі ўстановамі для рашэння шэрагу актуальных навукова-даследчых праблем з выкарыстаннем матэрыяльна-тэхнічнай базы інстытутаў АН БССР і іншых навукова-даследчых устаноў, зацікаўленых у атрыманні высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Далейшае развіццё павінна атрымаць вытворчая практыка студэнтаў, якая садзейнічае замацаванню тэарэтычных і прафесійных ведаў студэнтаў, развівае арганізатарскія здольнасці, выпрацоўвае навыкі работы ў калектыве.

Пытанне аб практыках патрабуе ад кафедр дасканалай метадычнай распрацоўкі. Кафедры павінны распрацаваць адпаведны вучэбна-метадычны матэрыял, каб студэнт яшчэ да практыкі пазнаёміўся па спецыяльных вучэбна-метадычных дапаможніках з задачамі і патрабаваннямі, з асаблівасцямі практыкі. Да пачатку новага навучальнага года неабходна поўнасцю па ўсіх спецыяльнасцях абнавіць праграмы практык, з улікам элементаў даследавання ў вытворчых умовах і прыцягнення студэнтаў-практыкантаў да дзейнасці калектыву прадпрыемстваў па выкананню народнагаспадарчых планаў. Спецыяльныя кафедры абавязаны планаваць вывучэнне часткі вучэбнага матэрыялу іменна ў перыяд практыкі. Састаўной часткай вытворчай практыкі павінна стаць грамадска-палітычная практыка.

Задачы камуністычнага будаўніцтва патрабуюць развіваць грамадска-палітычную актыўнасць студэнцкай моладзі, прывіваць ёй навыкі арганізатарскай і выхаваўчай работы. Рэктарат, партком і грамадскія арганізацыі універсітэта арганізавалі работу па здзяйсненню праграмы грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў. Выкананне гэтай праграмы з'явіцца важнай умовай усебаковага выхавання студэнцтва.

У адказ на Зварот ЦК КПСС да партыі, да савецкага народа калектывамі кафедр, факультэтаў, аддзелаў і служб універсітэта прыняты павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы на чацвёрты год пяцігодкі. Рэктарат выражае ўпэўненасць у тым, што кафедры, факультэты, увесь калектыў універсітэта паспяхова выканаюць гэтыя абавязацельствы і прыкладуць максімум намаганняў для далейшага павышэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.






Гэтыя здымкі наш фотакарэспандэнт зрабіў на спецсемінары па дыялекталогіі ў студэнтаў II курса беларускага аддзялення філфака.

● Момант абмеркавання.

● З дакладам выступае Рэгіна Стэльмах.

Фота Д. Чаховіча.



# КАБ НЕ ЦЯГНУЛАСЯ НІТАЧКА...

Сустрэча з Верай Лаўчыноўскай, адказнай за акадэмічную работу камітэта камсамола гістарычнага факультэта, была абумоўлена дзвюма прычынамі. Па-першае, гістфак заняў трэцяе месца па выніках зімовай сесіі; лепшая акадэмічная група ва універсітэце — першы курс аддзялення філасофіі.

Па-другое... Студэнт або студэнтка дрэнна вучацца, з сесіі ў сесію цягнуцца «хвасты», пастаянныя пропускі заняткаў. Як быць у такім выпадку? Часта прыходзіцца чуць: «Чалавек ужо дарослы. Сам выбіраў вну. Гэта не школа, дзе цябе ўсё яшчэ «цягнулі за ручку». Не хочаш вучыцца — ідзі і не займай месца іншага... Такому ўжо ніхто і нішто не дапаможа» Ці так гэта? Ці маем мы права зводзіць работу акадэмсектара да нуля?

— Акадэмічная работа... Канчатковая яе мэта — дапамагчы чалавеку знайсці сябе ў свеце ведаў. Гэта, канешне, не азначае, што мы — актыў акадэмсектара будзем дапамагаць, так сказаць, «вызначацца» ўсім 800 студэнтам нашага факультэта, — гаворыць Вера.—Большасць студэнтаў самі знаходзяць «пункт прыкладання» сваіх сіл (да вну або ўжо тут). Але ёсць яшчэ і меншасць, якая патрабуе дапамогі.

Многа ўвагі патрабуе першакурснік. Таму ўжо традыцыйнымі сталі на факультэце сустрэчы першакурснікаў са студэнтамі старэйшых курсаў напярэдадні першай сесіі, якая здаецца пачынаючым непераадольным бар'ерам. Не менш адказны час і цяпер, калі пачалася пара курсавых работ.

Два разы ў месяц збіраецца наш актыў (32 чалавекі): вучымся працаваць, дзелімся вопытам, вырашаем наспеўшыя праблемы. Іменна тут і здзяйсняецца адваротная сувязь: сектар—група, група—сектар. Дзякуючы гэтай сувязі мы бачым не проста факультэцкія праблемы, задачы, а канкрэтных людзей. Бо канкрэтны чалавек — гэта і здольны, умеючы самастойна працаваць студэнт, гэта і«хвасціст», гэта выпадковы на данным факультэце, а, можа, і ў вну чалавек. Праўда, такіх, сапраўды «выпадковых» — адзінкі. На наш факультэт праз вялікі конкурс і высокі прахадны бал прыходзяць людзі з трывалымі ведамі. Проста калісьці чалавек ці то па асабістай ляноце, ці па якіх іншых прычынах не выканаў заданне, не падрыхтаваўся да практычных, прапусціў лекцыю... Не спыніш яго ў час — так і пацягнецца нітачка, выпадковасць стане прывычнай. Тут ужо павінен дзейнічаць акадэмсектар: каму трэба працягнуць руку дапамогі, а каго «падагнаць» адміністрацыйнымі мерамі. Галоўнае — не спазніцца. Адсюль і вынікае, першачарговая задача акадэмсектара — улік і кантроль, пастаянны, паўсядзённы, строгі. Вялікая адказнасць ускладаецца на камсамольскае бюро групы. На нашым факультэце ў кожнай групе акадэмсектар вядзе «Сшытак уліку і кантролю». Ён дапамагае своечасова вырашаць многія пытанні.

Т. ЛЕАНКОВА.

# УСЛЕД ЗА НАСТАЎНІКАМ

Свае першыя крокі ў свет навукі будучыя фізікі робяць яшчэ ў студэнцкія гады. Яркім прыкладам шырокага прыцягнення студэнтаў да навукова-даследчай работы з'яўляецца кафедра паўправаднікоў фізічнага факультэта. У навуковых лабараторыях кафедры часта можна сустрэць не толькі студэнтаў IV і V курсаў, якія выконваюць курсавыя і дыпломныя работы, прадугледжаныя вучэбным планам, але і студэнтаў малодшых курсаў. Іх прыцягвае сюды працэс даследавання. Выкарыстоўваючы самыя сучасныя прыборы і абсталяванне, студэнты знаёмяцца з метадамі даследавання паўправаднікоў і паўправадніковых прыбораў. Такія заняткі навуковай работай даюць магчымасць зразумець, што любому поспеху, любому навуковаму дасягненню заўсёды папярэднічае карпатлівая, паўсядзённая работа, што на шляху да гэтага поспеху магчымы і няўдачы, і расчараванні, што неабходна пастаяннае папаўненне навуковых ведаў, пастаяннае ўдасканаленне метадаў даследаванняў.

Цяпер ужо стала традыцыяй правядзенне штотыднёвых навуковых семінараў кафедры. На іх абмяркоўваюцца самыя актуальныя праблемы і апошнія дасягненні фізікі паўправаднікоў. Непасрэдны ўдзел у гэтых семінарах прымаюць студэнты. Тут адбываецца як бы сціранне мяжы паміж выкладчыкамі, супрацоўнікамі і студэнтамі. Кожны прысутны на семінары можа прыняць удзел у дыскусіі, выказаць свой пункт гледжання. Удзел у семінарах не толькі расшырае кола навуковых ведаў, але і вучыць думаць, аналізаваць.

Вынікі студэнцкай навуковай работы падводзяцца на штогадовай навуковай студэнцкай канферэнцыі, прысвечанай дню нараджэння У. І. Леніна.

На канферэнцыі мінулага года студэнтамі кафедры было прачытана 28 дакладаў. Дзевятнаццаць студэнцкіх навуковых работ, якія ўтрымліваюць самастойныя навуковыя даследаванні, былі прадстаўлены на рэспубліканскі конкурс. Сямі з іх прысуджана І катэгорыя. Работа студэнта Фан Тхань Дау атрымала III прэмію конкурсу. Студэнты Н. Драздоў і В. Сідорык выступілі з дакладам ў Азербайджанскім універсітэце.

Аб высокім узроўні студэнцкай творчасці сведчыць і той факт, што работы Мінаева і Ноунг прыняты да друку і будуць апублікаваны ў саюзных часопісах.

Шырокі ўдзел студэнтаў у навуковай рабоце, іх першыя навуковыя поспехі і дасягненні сведчаць аб вялікай увазе выкладчыкаў і супрацоўнікаў кафедры да навуковых пошукаў студэнтаў.

Да красавіцкай канферэнцыі студэнты кафедры падрыхтавалі 38 дакладаў.

**Т. КАЛЬЧЭНА,**
**асістэнт кафедры фізікі паўправаднікоў.**

# МІКРАБІЁЛАГІ АТРЫМАЛІ ЛАБАРАТОРЫЮ

У канцы мінулага года рашэннем савета біялагічнага факультэта пры кафедры мікрабіялогіі была створана студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя (СНДЛ). Абавязкі загадчыка ўскладзены на асістэнта кафедры мікрабіялогіі С. П. Чарнова. Разам з лабарантамі і студэнтамі ён займаўся абсталяваннем СНДЛ.

Зараз лабараторыі выдзелена асобнае памяшканне, набыты неабходныя прыборы і разгортваюцца даследчыя работы. Так, напрыклад, студэнт IV курса А. Еўтушэнкаў займаецца выдзяленнем і вывучэннем біялагічных уласцівасцей фітапатагенных (хваробатворных для раслін) бактэрый. Студэнт IV курса В. Варганаў удзельнічае ў распрацоўцы навуковай тэмы па раздзелу, які прысвечан вывучэнню некаторых асаблівасцей рэкамбінацыйнага працэсу ў бактэрый. Студэнты III курса В. Шчэрба, А. Мішын і В. Кандрат працуюць па гаспадарча-дагаворнай тэме «Біялагічная характарыстыка бактэрыяфагаў малочнакіслых бактэрый».

Да работы ў лабараторыі прыцягваюцца і студэнты малодшых курсаў. Яны ўдзельнічаюць у рабоце тэарэтычнага семінара СНДЛ, а таксама дапамагаюць пры правядзенні доследаў сваім старэйшым таварышам. На семінарах лабараторыі студэнты абмяркоўваюць пытанні, звязаныя з метадамі пэўных эксперыментальных даследаванняў і тэарэтычнымі аспектамі вывучаемых праблем.

Наша лабараторыя яшчэ вельмі маладая. Але гэта ўжо дружны, баявы калектыў, які не толькі паспяхова вядзе навукова-даследчую работу, але і актыўна ўдзельнічае ў СНТ факультэта.

**Н. ЛУГІНІН,**
**намеснік старшыні савета СНТ.**

*НАМ ПІШУЦЬ*

# ДЗЯКУЙ ШЭФАМ

ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ БДУ толькі нядаўна стаў шэфам нашай сярэдняй школы № 7 г. Слуцка, але ўжо аказаў вялікую дапамогу.

Знаёмства пачалося з таго, што ў лістападзе юныя хімікі наведалі лабараторыі хімфака. Цікава расказалі аб сваёй рабоце дацэнты В. П. Мардыкін, П. А. Матусевіч і іншыя. Рабяты з захапленнем разглядалі апаратуру і прыборы, з якімі працуюць студэнты. Яны пераканаліся ў тым, што вельмі многа трэба ведаць, каб паступіць на гэты факультэт.

Усю дарогу з Мінска ў Слуцк настрой ва ўсіх быў выдатны, у аўтобусе толькі і ішла гутарка аб хімфаку. Важна было і тое, што мы везлі ў школу многа хімрэактываў, прыборы, посуд — падарунак нашых шэфаў. Радаваліся, што цяпер у нас у школе ёсць усё неабходнае для правядзення доследаў.

А ў сярэдзіне сакавіка да нас у школу прыехала група студэнтаў — 35 чалавек, якія расказалі нам аб хімфаку, аб студэнцкім жыцці, прадэманстравалі займальныя доследы і паказалі вялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці. На вечары былі не толькі юныя хімікі нашай школы, але і прадстаўнікі іншых школ горада.

Мы шчыра ўдзячны дэкану хімфака Генадзю Аляксеевічу Браніцкаму і намесніку дэкана Віктару Васільевічу Самахвалу, якія клапоцяцца аб нас. Вялікае дзякуй сакратару камітэта камсамола Алегу Івашкевічу, Яўгеніі Радыён і Яўгену Макарэвічу — кіраўнікам агітбрыгады студэнтаў за арганізацыю нашай сустрэчы, а таксама Уладзіміру Ажэгаву за расказ аб хімфаку, Людміле Палойка за дэманстрацыю доследаў і ўсім студэнтам, якія пабывалі ў нашай школе.

Нядаўна наш выкладчык хіміі Іван Мікалаевіч Нікановіч паведаміў нам цікавую навіну: дэканат хімфака і камітэт камсамола рашылі запрасіць чатырох юных хімікаў нашай школы на канферэнцыю, прысвечаную Дню хіміка. Хто паедзе, мы яшчэ не ведаем, але ўсім вельмі хочацца трапіць на вечар да нашых шэфаў.

Заканчваючы пісьмо, мы яшчэ раз дзякуем нашым шэфам і гаворым: «Да новых сустрэч!».

**Ірына КІРЫЛОВІЧ,**
**старшыня секцыі «Юны хімік»,**
**Таццяна ГЛАДКАЯ,**
**рэдактар насценгазеты «Мендзялеевец».**

## СВЯТА САЛІДАРНАСЦІ

У актавай зале інтэрната № 5 адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны трэцяй гадавіне з дня абвяшчэння незалежнасці Народнай Рэспублікі Бангладэш.

Аб цяжкай, кровапралітнай барацьбе свабодалюбівага бенгальскага народа за суверэнітэт сваёй радзімы расказалі студэнты зямляцтва Бангладэш у Мінску.

З прывітаннем да народа Бангладэш і яго прадстаўнікоў у Мінску звярнуліся дэкан падрыхтоўчага факультэта універсітэта М. К. Гербачоў, інспектар Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. Р. Трухан, выкладчык кафедры рускай мовы падрыхтоўчага факультэта А. С. Ляцецкая.

Цёпла былі сустрэты прадстаўнікі зямляцтваў Конга (Браззавіль), ГДР, Гвінеі, ДРВ і інш.

Пасля ўрачыстай часткі адбыўся канцэрт мастацкай самадзейнасці савецкіх і замежных студэнтаў.

**В. СІЗОЎ,**
**старшыня студсавета інтэрната № 5.**






Уладзіміра Ламеку на філфаку, безумоўна, ведаюць усе. Ды і як яго не ведаць! Выдатнік, член камітэта камсамола, актыўны ўдзельнік мастацкай самадзейнасці.

А калі надыходзіць пара працоўнага семестра, Валодзя абавязкова ў страі будаўнічага атрада.

Хлопец па праву носіць значок «За выдатную вучобу».

Наш фотакарэспандэнт Д. Чаховіч зазняў Уладзіміра ў рэдкую хвіліну адпачынку.

Фота **Д. Чаховіча.**

## СПРАВЫ ФАКУЛЬТЭЦКІЯ

Другі месяц ідуць вучэбныя заняткі на факультэце павышэння кваліфікацыі. Слухачам ужо прачытан шэраг цікавых змястоўных лекцый па гісторыі КПСС, навуковаму камунізму, марксісцка-ленінскай філасофіі, палітычнай эканоміі, этыцы, эстэтыцы, псіхалогіі, навуковай арганізацыі працы выкладчыка і шэрагу іншых дысцыплін. Актыўна праходзяць семінарскія заняткі.

Аб тым, што зроблена і што належыць зрабіць, каб паспяхова выканаць вучэбную праграму, ішла нядаўна размова на факультэцкім адкрытым партыйным сходзе. З дакладам аб ходзе вучэбнага працэсу выступіў дэкан факультэта П. П. Борсук.

Сход нікога не пакінуў раўнадушным. У спрэчках выступілі многія камуністы і беспартыйныя. Сярод іх стараста курса палітэканомаў В. П. Бакулін, стараста курса Л. А. Бароўскі, сакратар партыйнай арганізацыі факультэта А. З. Смірноў, слухач Г. І. Пяроў і іншыя. Яны ўнеслі шэраг прапаноў, накіраваных на удасканаленне вучэбнага працэсу.

Акрамя таго, ішла размова аб удзеле слухачоў ФПК у Ленінскім камуністычным суботніку. Створан штаб па яго правядзенню. У дзень Чырвонай суботы слухачы факультэта дапамогуць каменданту інтэрната ў навядзенні парадку, будуць працаваць па добраўпарадкаванню горада.

**С. СТАНІСЛАВАЎ.**

## У ГОНАР НАРОДНАЙ ПОЛЬШЧЫ

З 15 па 21 красавіка ва універсітэце пройдуць урачыстасці, прысвечаныя 30-й гадавіне адраджэння Польшчы.

На курсах, у групах, інтэрнатах адбудуцца лекцыі і гутаркі аб поспехах сацыялістычнага будаўніцтва ў ПНР.

Кніжныя і фотавыстаўкі, дакументальныя кінафільмы пазнаёмяць універсітэцкі калектыў з тымі пераўтварэннямі, якія адбыліся ў розных галінах жыцця народнай Польшчы за 30 гадоў.

Шэраг дакладаў юбілейнай тэматыкі будзе прачытан на студэнцкай навуковай канферэнцыі, прысвечанай гэтай знамянальнай даце.

**М. МАЦЕЙКА.**

## УВАЗЕ ДЭКАНАЎ, ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДР, ЛАБАРАТОРЫЙ І ІНЖЫНЕРНА-ТЭХНІЧНАГА ПЕРСАНАЛУ!

Беларускі дзяржаўны універсітэт заключыў дагавор з аддзяленнем пракату навуковай апаратуры, прыбораў і лабараторнага абсталявання пры ўпраўленні «Белнавучснабзбыт» аб комплексным абслугоўванні.

У аддзяленні пракату ёсць радыёвымяральныя, электравымяральныя, оптыка-механічныя прыборы, лабараторнае абсталяванне, вылічальная і аргтэхніка, навукова-дэманстрацыйныя і іншыя прыборы.

Парк прыбораў няспынна папаўняецца навейшымі ўзорамі.

За карыстанне прадметамі пракату аддзяленне бярэ плату ў размеры 4,62 працэнта ў месяц ад кошту прыбора.

Карыстанне паслугамі пракату дазваляе своечасова і бесперапынна атрымліваць неабходныя вымяральныя прыборы і лабараторнае абсталяванне, зніжаць затраты на правядзенне навуковых даследаванняў.

Выдача прыбораў напракат праводзіцца па адрасу: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 15-а, тэлефоны 32-05-46, 32-24-62.

Інфармацыйна-пасрэдніцкая служба размешчана па адрасу г. Мінск, вул. Абутковая, 72, тэлефон 23-47-64.

**Карыстайцеся паслугамі пракату!**

СТУДЭНТ І НАВУКА

# ВЫХАВАННЕ ДАСЛЕДЧЫКА

У НАШЫ ДНІ матэматыка ўсё глыбей пранікае ў самыя розныя галіны чалавечай дзейнасці, пастаянна расшырае сферу свайго прымянення. Таму асабліва важна, каб будучы спецыяліст-матэматык валодаў творчым падыходам да рашэння розных пытанняў практыкі, меў навыкі самастойнай даследчай работы.

Як жа пастаўлена студэнцкая навуковая работа на матэматычным факультэце БДУ?

Трэба, відаць, вылучыць два этапы, якія праходзіць студэнт-матэматык, займаючыся навуковай работай. Першы этап — падрыхтоўчы. Каб у будучым студэнт змог самастойна весці даследаванні, яму трэба, перш за ўсё, набыць паглыбленыя веды па розных раздзелах матэматыкі, не абмяжоўваючыся тым, што прадугледжана вучэбным планам. І тут вялікую дапамогу яму аказваюць гурткі пры кафедрах і факультатыўныя спецкурсы.

На кафедральных гуртках студэнты робяць даклады па тэмах, якія дазваляюць пашырыць навуковы кругагляд, паглыбіць веданне праграмных дысцыплін. Так, у мінулым годзе на гуртку па матэматычнаму аналізу (кіраўнікі дацэнт Ф. В. Чумакоў і старшы выкладчык С. Я. Рудакоўская) студэнты знаёміліся з элементамі тэарэтыкамножнай тапалогіі і тэорыі метрычных прастораў. У гэтым годзе намячаюцца даклады, якія пазнаёмяць членаў гуртка — студэнтаў II курса — з сучаснай пабудовай дыферэнцыяльнага вылічэння функцый многіх пераменных. Кожны год для студэнтаў-першакурснікаў арганізуецца гурток па алгебры, якім кіруюць дацэнт Р. І. Тышкевіч, ст. выкладчык М. М. Талкачоў і іншыя супрацоўнікі кафедры алгебры. На занятках гэтага гуртка студэнты знаёмяцца з некаторымі пытаннямі тэорыі мностваў, тэорыі груп, палёў, кольцаў.

На факультэце працуюць таксама гурткі па дыферэнцыяльнай геаметрыі, тэарэтычнай механіцы, дыферэнцыяльных ураўненнях. Важную частку у рабоце ўсіх гурткоў складае разбор рашэнняў арыгінальных задач.

Для студэнтаў малодшых курсаў арганізуюцца таксама факультатыўныя курсы лекцый, якія знаёмяць іх з важнейшымі напрамкамі развіцця сучаснай матэматыкі. У мінулым годзе прафесар В. І. Вядзернікаў прачытаў факультатыўны курс па асновах агульнай тапалогіі; сёлета аналагічны курс чытае доктар фізіка-матэматычных навук А. С. Фядэнка. Дацэнт І. А. Паўлаў вядзе факультатыў па алгебры для студэнтаў I—II курсаў.

Папулярызацыя гэтых гурткоў і лекцый, прыцягненне да іх як мага большай колькасці студэнтаў, шэфства над некаторымі гурткамі — важная частка работы СНТ на малодшых курсах.

Другі напрамак на першым этапе заключаецца ў тым, каб дапамагчы студэнтам I—II курсаў правільна вызначыць кола сваіх інтарэсаў у матэматыцы і выбраць спецыялізацыю. З гэтай мэтай у «Весніку СНТ» публікуюцца артыкулы супрацоўнікаў розных кафедр факультэта, якія ў даступнай форме расказваюць аб выніках, атрыманых на іх кафедрах, аб напрамках кафедральных даследаванняў. З той жа мэтай праводзяцца так званыя дні кафедр. У мінулым годзе былі праведзены дні кафедр алгебры і матэматычнага аналізу, у час якіх перад студэнтамі выступалі супрацоўнікі кафедр, вучоныя з інстытута матэматыкі АН БССР.

Другі этап — менавіта навуковае даследаванне — пачынаецца звычайна толькі на III—IV курсах. Да гэтага часу студэнты ўжо праходзяць размеркаванне па кафедрах і слухаюць паглыбленыя спецкурсы па выбранай спецыяльнасці. Паралельна спецкурсам часта праводзяцца спецсемінары. Яны ўжо непасрэдна падводзяць студэнта да самастойных даследаванняў.

Асноўная форма навуковай работы старшакурсніка — індывідуальныя даследаванні па заданнях навуковага кіраўніка. На аснове найбольш цікавых вынікаў пішуцца студэнцкія навуковыя работы, якія могуць быць рэкамендаваны кафедрай на універсітэцкую студэнцкую навуковую канферэнцыю, рэспубліканскі і усесаюзны агляды. Падрыхтоўка і ўдзел у такіх канферэнцыях і аглядах — важнейшая частка работы СНТ на старэйшых курсах.

На рэспубліканскі агляд 1972—1973 навучальнага года матэматычны факультэт прадставіў 14 работ. 10 з іх атрымалі I катэгорыю. На усесаюзным аглядзе рабоце І. Сандрыгайлы «Аб краявой задачы Гільберта з бясконцым індэксам» быў прысуджан залаты медаль.

У гэтым годзе на рэспубліканскім аглядзе ад матэматычнага факультэта было прадстаўлена 13 работ, 10 атрымалі першую катэгорыю. Рабоце В. Бабіча «Глабальная тэорыя сеткі» была прысуджана II прэмія. Большасць работ, такім чынам, выканана на высокім навуковым узроўні.

У СНТ матфака ўваходзіць цяпер 135 чалавек, даследчая работа з'яўляецца абавязковай для студэнтаў усіх курсаў. Аднак на розныя агляды і конкурсы прадстаўляюцца толькі арыгінальныя вынікі. Большасць з іх, няхай невялікія, але навуковыя адкрыцці. Атрымаць жа такія вынікі ўдаецца не часта і не кожнаму. Гэтым тлумачыцца сціплая лічба ўдзельнікаў конкурсаў і аглядаў.

Тым не менш мы лічым неабходным зрабіць усё для таго, каб студэнцкая навуковая работа на факультэце набыла масавасць, каб больш работ вылучалася кафедрамі на агляды і канферэнцыі. У гэтым мы бачым нашу важнейшую задачу.

**І. ВАЛІЧЭНКА,**
**старшыня савета СНТ матфака.**

# РЫХТУЙЦЕСЯ ДА АГЛЯДУ!

## ПАЛАЖЭННЕ АБ АГЛЯДЗЕ МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ ФАКУЛЬТЭТАЎ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

**Мэта агляду** — далейшае развіццё мастацкай самадзейнасці, масавасці ўсіх жанраў і відаў самадзейнага мастацтва, паляпшэнне эстэтычнага выхавання савецкага студэнта, прапаганда ў мастацкай форме перамогі ленінскай нацыянальнай палітыкі, гістарычных перамог, завяяваных савецкім народам пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, барацьба за мір і дружбу паміж народамі.

**Арганізатарамі агляду з'яўляюцца:** рэктарат, партком, камітэт камсамола, мясцком, прафком і праўленне студэнцкага клуба.

Агляд мастацкай самадзейнасці праводзіць арганізацыйны камітэт у наступным складзе: С. А. Лысенка, У. А. Навумовіч, А. М. Жылінскі, А. А. Фядотаў, В. І. Герасіменка.

У журы агляду ўваходзяць кіраўнікі народных калектываў мастацкай самадзейнасці універсітэта, а таксама прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Журы вызначае тры першыя месцы. Два аднолькавыя месцы не прысуджаюцца. Месцы вызначаюцца па лепшай суме балаў. Нумары праграмы канцэртаў мастацкай самадзейнасці ацэньваюцца журы па 10-бальнай сістэме. Журы мае права здымаць ад 1 да 5 балаў за нумары, якія не вызначаюцца высокім ідэйным і мастацкім узроўнем.

Пры падвядзенні вынікаў журы будзе ўлічваць тэматыку твораў, выканаўчае майстэрства, масавасць і ўдзел ва універсітэцкай мастацкай самадзейнасці.

**Галоўныя паказчыкі для падвядзення вынікаў:**

Сума балаў, якую атрымаў факультэт за лепшыя 15 нумароў праграмы; удзел у агульнауніверсітэцкіх калектывах мастацкай самадзейнасці; шэфская работа на прадпрыемствах, у калгасах і школах; колькасць культпаходаў, лекцый, вечароў адпачынку.

Ацэньваючы мастацкі ўзровень выканання, журы звяртае ўвагу і на сцэнічную культуру ўдзельнікаў агляду. Журы мае права заахвоціць факультэт (ад 5 да 10 балаў) за добрае сцэнічнае рашэнне канцэртнай праграмы.

Рашэнне журы аб'яўляецца на заключным канцэрце — 8 мая 1974 года.

**Састаў журы:** старшыня— С. А. Лысенка, член парткома.

Члены: А. М. Озераў, заслужаны артыст Латвійскай ССР; М. А. Лісіцын, заслужаны работнік культуры БССР; М. В. Лапша, кіраўнік народнага ансамбля танца; Н. В. Палявая, кіраўнік народнай харавой капэлы; А. А. Фядотаў, старшыня праўлення клуба; З. А. Зяневіч, старшыня культмасавай камісіі мясцкома; В. І. Герасіменка, мастацкі кіраўнік клуба; Ю. С. Шынкар, старшыня культмасавай камісіі камітэта камсамола.

У састаў журы таксама ўваходзяць прадстаўнікі факультэтаў.

**Месца і час**

Агляд мастацкай самадзейнасці праводзіцца ў актавай зале галоўнага корпуса ў наступныя тэрміны:

22 красавіка ў 19-00 — юрфак; ў 20-30 — геафак;
23 красавіка ў 19-00 — хімфак; ў 20-30 — фізфак;
24 красавіка ў 19-00 — гістфак; ў 20-30 — матфак;
25 красавіка ў 19-00 — журфак; ў 20-30 — філфак;
26 красавіка ў 19-00 — ФПМ; ў 20-30 — біяфак.

**Умовы**

У аглядзе могуць прымаць удзел студэнты стацыянарнага, вячэрняга і завочнага навучання, аспіранты і выкладчыкі.

Факультэту прадастаўляецца права правесці рэпетыцыю ў актавай зале непасрэдна ў дзень агляду працягам не болей дзвюх гадзін.

У час агляду факультэты паказваюць паўтарагадзінную праграму. Кожны факультэт павінен як мага шырэй ахапіць розныя жанры і формы самадзейнага мастацтва: вакальныя ансамблі, танцавальныя групы, індывідуальныя выканаўцы, мастацкае чытанне, народныя і эстрадныя аркестры і ансамблі, выканаўцы-інструменталісты (фартэпіяна, скрыпка, народныя інструменты), тэатр, пантаміма і інш. Кожны саліст мае права выканаць не больш двух твораў.

Факультэт атрымлівае за кожнага ўдзельніка універсітэцкай мастацкай самадзейнасці 3 балы.

Для кожнага жанра ўстанаўліваюцца 3 першыя месцы, за якія факультэты атрымліваюць дадатковыя балы:

**харавыя калектывы:**

I месца — 30 балаў
II месца — 20 балаў
III месца — 10 балаў

**ансамблі, дуэты, трыо:**

I месца — 20 балаў
II месца — 15 балаў
III месца — 10 балаў

**салісты:**

I месца — 15 балаў
II месца — 10 балаў
III месца —5 балаў

Праграмы канцэрта неабходна прадставіць у праўленне клуба не пазней 14 красавіка ў 6 экземплярах, з указаннем імя і прозвішча аўтараў і выканаўцаў.

**Узнагароджанне**

Калектыў мастацкай самадзейнасці факультэта, які заняў першае месца, узнагароджваецца пераходным Чырвоным сцягам, Ганаровай граматай і грашовай прэміяй.

Калектывы, якія зоймуць другое і трэцяе месцы, узнагароджваюцца Ганаровымі граматамі і грашовымі прэміямі.

Установлены спецыяльныя прызы: за масавасць, за лепшае выкананне патрыятычнай песні, за лепшае вядзенне праграмы.

**АРГКАМІТЭТ.**

# ДОЎГІХ ГАДОЎ ТАБЕ, ПЛЁННАЙ ПРАЦЫ!

**1 красавіка факультэту прыкладной матэматыкі споўнілася чатыры гады. Адзначэнне гэтай даты вылілася ў вялікае студэнцкае свята.**

**Гасцінна расчыніліся дзверы**

для школьнікаў, што прыйшлі пазнаёміцца з факультэтам. Многія з іх вырашылі звязаць сваё жыццё з матэматыкай. Напрыклад, Таня Быкава з сярэдняй школы № 50:

— Чым менш часу застаецца да экзаменаў, тым больш я ўпэўніваюся, што абрала «сваю» спецыяльнасць. Пасля наведання факультэта мне стала зразумела, у якім напрамку неабходна ўдасканальваць свае веды. Асабліва прыемна адчуванне святочнасці, якое тут пануе.

У госці да студэнтаў у гэты дзень прыязджалі камсамольцы з Маладзечна, з падшэфных школ — Ляхавіцкай і Слабодскай. Вялікае ўражанне на іх зрабіў вылічальны цэнтр.

Перад малодшымі сябрамі выступіў студэнт IV курса Л. Гарадзецкі. Ён расказаў аб студэнцкім жыцці, рабоце факультэцкай камсамольскай арганізацыі.

**Шчыра, захапляюча**

выступаў у суботу на вечары адпачынку калектыў мастацкай самадзейнасці ФПМ. Агітбрыгада паказала сваю новую праграму, прысвечаную 50-годдзю прысваення камсамолу імя У. І. Леніна.

Гледачы доўга не адпускалі са сцэны А. Новікава і Л. Макарэвіча. Частушкі ў іх выкананні спадабаліся ўсім.

Пуцёўку ў вялікі свет атрымаў ансамбль баяністаў, які выступаў упершыню. Гучала чароўная музыка Штрауса і Шастаковіча...

**З усіх куткоў краіны**

— Масквы, Горкага, Томска, Пярмі, Тбілісі, Варонежа, Караганды, Казані, Ерэвана, Краснадара і нават з Уладзівастока зляцеліся на святкаванне госці— студэнты і выкладчыкі, прадстаўнікі факультэтаў прыкладной матэматыкі.

— Мы запрашаем гасцей не ўпершыню, — тлумачыць А. Новікаў, адказны за культурна-масавую работу. — Факультэтаў прыкладной матэматыкі і кібернетыкі не так ужо многа. Узніклі яны зусім нядаўна. Канешне, маладым ФПМ неабходны ўзаемная падтрымка, дапамога. Наш факультэт узяў на сябе ініцыятыву арганізоўваць такія сустрэчы. Нам ёсць чаму вучыць і ёсць чаму вучыцца.

Гэтыя словы пацвердзілі гарачыя дыскусіі за «круглым сталом». Госці і гаспадары абмеркавалі шляхі пашырэння сувязей, праблему існавання школ матэматыкаў пры ФПМ і іншыя.

Знаёмства з горадам для гасцей пачалося з наведання краязнаўчага музея, ВДНГ. Потым была экскурсія па Мінску, а ў нядзелю — паездка на Курган Славы і ў Хатынь.

— За пяць дзён мы палюбілі Мінск і універсітэт, — сказала перад ад'ездам Г. Адзінцова; студэнтка з Пярмі.

**Унесці знамёны!**

— так пачаўся заключны ўрачысты вечар. Намеснік дэкана факультэта Н. І. Юрчук расказаў гісторыю стварэння ФПМ, параўнаў дзень сёняшні з днём мінулым.

Бадай, не ўсе помняць, што чатыры гады назад на базе матэматычнага факультэта было створана пяць кафедр ФПМ, на якіх займалася каля 500 студэнтаў.

— Цяпер мы маем дзевяць кафедр і больш за 1000 студэнтаў. За гады існавання факультэта абаронена дзве доктарскія і 14 кандыдацкіх дысертацый. Павялічыўся вылічальны цэнтр.

— На вачах расце, сталее і камсамольская арганізацыя, — гаворыць сакратар камітэта камсамола універсітэта У. Навумовіч. Ён называе прозвішчы лепшых камсамольцаў, выдатнікаў вучобы, актывістаў, адзначае станоўчую працу СНТ, інтэрнацыянальнага і шэфскага сектараў.

— Вы ўжо сёння думаеце аб заўтрашнім дні факультэта. Ідучы да школьнікаў, дапамагаючы ім, вы рыхтуеце сабе змену.

У гэты дзень выступаўшых было шмат. Перапоўненая зала апладзіравала краснадарцу Н. Дуброўскаму, варонежцу А. Сазанаву, Б. Муратаву з Таджыкістана. На розных мовах гучала сардэчнае «Віншуем!»

Віншавалі і першакурснікаў. Адбылася і яшчэ адна ўрачыстасць — пасвячэнне ў студэнты. Першы курс з гонарам вытрымаў такое сур'ёзнае выпрабаванне, як сесія. Цяпер яго можна залічыць у «вялікае праграмісцкае брацтва».

Як і належыць у першы дзень красавіка, не абышлося без жартаў і гумару. Зала весела сачыла за паходжаннямі Астапа Бендэра і яго памочнікаў на ФПМ. Вялікі камбінатар не згадзіўся вучыцца на такім «цяжкім факультэце».

**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**



**Б. Каліцін гутарыць з госцем з Тбілісі С. Рамадзе.**
**Фота Г. Марозава.**



# СПАБОРНІЧАЮЦЬ РЫЦАРЫ ШПАГІ

Фехтавальны спорт у нашай рэспубліцы развіваецца незвычайна хуткімі тэмпамі. Гэтаму садзейнічае развітая сетка спецыялізаваных спартыўных школ, наяўнасць высокакваліфікаваных трэнераў, добра пастаўленая арганізацыя розных турніраў і спаборніцтваў. Таму не дзіўна, што і ў вышэйшых навучальных установах ідзе паспяховая падрыхтоўка спартсменаў высокага класа. У нашым універсітэце, напрыклад, толькі ў гэтым навучальным годзе падрыхтаван адзін майстар спорту, 4 кандыдаты ў майстры і два спартсмены I разраду. Пры БДУ створана спецыялізаваная дзіцячая спартыўная школа, вучні якой у далейшым змогуць абараняць гонар нашай навучальнай установы. Аналагічная работа праводзіцца і ў іншых вну рэспублікі. Таму не дзіўна, што на студэнцкім першынстве Беларусі, якое праходзіла ў канцы сакавіка ў Магілёве, са 168 удзельнікаў каля 50 працэнтаў—83 чалавекі склалі кандыдаты і майстры спорту.

Спаборніцтвы праходзілі ў жорсткай канкурэнтнай барацьбе дзякуючы ўвядзенню абмежаванага заліку (улічваліся толькі 12 лепшых вынікаў у асабістых і камандных спаборніцтвах).

Героямі першага дня спаборніцтва сталі нашы рапірысты Сяргей Барадзін (II курс юрфака) і выпускнік хімфака Уладзімір Парткоў. С. Барадзін і майстар спорту Маносаў з Магілёўскага пед-інстытута ўзначалілі спіс прэтэндэнтаў на I месца, аднак ні аднаму з іх не ўдалося пазбегнуць горычы паражэння. Усё павінен быў рашыць бой паміж Маносавым і Партковым. Калі Парткоў выйграе, дык Барадзін выходзіць на першае месца, калі ж прайграе, дык пераможцу выявіць бой паміж прэтэндэнтамі. Гэта быў захапляючы, прыгожы паядынак двух роўных байцоў з маланкавымі атакамі і хуткім перамяшчэннем. Лік рос паступова: 1:0, 1:1, 2:1, 2:2... 4:4. Напружанне дасягнула максімуму. Парткоў кідаецца ў атаку... і лік 5:4. Балельшчыкі цалуюць Валодзю—у яго IV месца— і віншуюць Сяргея Барадзіна са званнем чэмпіёна і выкананнем нарматыву майстра спорту СССР. Поспехі астатніх нашых рабят больш сціплыя: у саблі Міша Шубіч (журфак, IV курс) заняў 11 месца, у жаночай рапіры Святлана Салдатава (выкладчык дзіцячай спартыўнай школы пры БДУ)—7 месца, Таццяна Дронь (гістфак, II курс) — 8 месца, у шпазе Уладзімір Лісоўскі — 6 месца.

У камандных спаборніцтвах рапірысты без вялікіх цяжкасцей прайшлі да фіналу і занялі II месца, прайграўшы ІФК з лікам 5:4. Саблісты занялі IV месца. Жанчыны паўтарылі поспех рапірыстаў: і ў іх другое месца. Усё ішло ўдала да выступлення шпажыстаў, якім яўна не пашанцавала з жэраб'ёўкай. Першая сустрэча звяла іх з моцнай камандай Гомельскага універсітэта. Перажыванне з-за няўдалага выступлення ў асабістых спаборніцтвах, адказнасць за лёс сваёй каманды, вялікае жаданне абавязкова выйграць будучыя сустрэчы—усё гэта прывяло да псіхалагічнага перанапружання. Шпажысты прайгралі ГДУ (5:4), а затым і сустрэчу з камандай Віцебскага педагагічнага інстытута і занялі 13 месца.

Камандныя месцы размеркаваліся наступным чынам:

I месца—інстытут фізічнай культуры — 207 ачкоў;
II месца—БДУ—109 ачкоў;
III месца—МРТІ—101 ачко;

**В. ХРЭНАЎ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**

**На здымку:** пераможцы В. Парткоў, С. Барадзін, С. Комскі.



У студэнтак ФПМ — заняткі па гімнастыцы.
Фота **П. Грабенчука.**

Рэдактар **А. А. НІКОЛЕНКА.**

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ём — 1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2000 экз.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 05188 Зак. 461.